ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“ДАШКОЛЬНЫ ЦЭНТР РАЗВІЦЦЯ ДЗІЦЯЦІ Г. ДЗЯРЖЫНСКА”

# “ДЗІКІЯ ЖЫВЕЛЫ”

Канспект занятку па адукацыйнай вобласці
“Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін”
для дзяцей сярэдняй группы

Аўтар: Сініца І. Я.,
выхавацель дашкольнай адукацыі

г.Дзяржынск, 2024

Праграмныя задачы: фарміравць уяўленні дзяцей пра дзікіх жывёл, фарміраваць уменне дзяцей называць дзікіх жывёл правільна. Вымаўляць гук “ў” у словах і сказах, фарміраваць уменне суадносіць назвы жывёл і іх дзяцянят практыкаваць у стварэнні назоўнікаў дзяцей жывёл з суфіксам – ят; практыкаваць у стварэнні назоўнікаў множнага ліку. Актывізаваць у мове дзяцей дзеясловы. Пашыраць слоўнік па тэме “Дзікія жывёлы”. Развіваць беражлівыя адносіны да прыроды. Выхоўваць цікавасць і любоў да роднай мовы, жаданне авалодаць ёю.

Папярэдняя работа: дыдактычныя гульні, разгледжванне малюнкаў з выявамі дзікіх жывёл, ілюстрацый, гутаркам на тэму”Дзікія жывёлы”, адгадванне загадак, чытанне апавяданняў пра жывёл.

Матэрыял: мультымедыйная прэзінтацыя, запіс гукаў прыроды; елачкі, цацкі: заяц, воўк, ліса, вавёрка; малюнкі з выявамі жывёл і іх дзяцей, малюнкі жылля звяроў, дзядок – Лесавічок (цацка); дрэвы – елкі.

Ход занятка:

Прывітанне

Сення раніцай мы прачнуліся,
Пацугнуліся, усміхнуліся,
Моцна за рукі вазьміцеся –
Сваёй цеплыней падзяліцеся.

Павіталіся сябры,
Пажадайце ўсім здароўя.
Лечыць вельмі добра
Дабрыня з любоўю.

В. – Скажыце, калі ласка, нашым гасця “Добрай раніцы”

- Дзеці, а вы любіце спадарожнічаць?

- Сення мы з вамі адправімся ў падарожжа.

- Куды ж нам пайсці?

Д. – Ці-ці-ці – куды пайсці? (хлопаюць у далонях)

- Аць- аць-аць – у лес адправіліся гуляць (хлопаюць па каленям)

В. – Ну что ж, пойдзем гуляць у лес. Я ведаю чароўныя словы, якія дапамогуць нам адправіцца у падарожжа.

- Ножкай тупнем, у далоні пляснем,

Вакол сябе павярніцеся,і ў лесе апынiцеся.

Слайд №1 Зімовы лес

В. - Вось мы і ў лесе на палянцы. Лес які? (зімовы) Чаму? (шмат снега)

- Паслухайце калі ласка, як у мяне завывае завіруха. (Гучыць фанаграмма “Гукі леса” “Завіруха”)

Дыхацельная гімнастыка з елачкамі

В. – Прапаную елкі ўзяць,

З імі дружна пагуляць.

- Вазьміце, калі ласка , елкі і разам падуем на іх як завіруха. Носам глыбока ўдыхаем, плаўна выдыхаем. Вось такая завіруха у нас.
- Давайце ўзгадаем, якія гукі зімы яшчэ можна пачуць у лесе. Як шуміць лес? (ш-ш-ш) Яксвішча вецер? (с-с-с) Як вые воўк? (у-у-у) Як цяўкае ліса? (цяў-цяў) Як рычыць мядзведзь? (р-р-р)
- Паслухайце, калі ласка, нехта нас сустракае ў лесе. (гучыць фанаграмма “Срып снега”)

В. – Дзеці, паглядзіце, а хто гэта? (дзядок Лесавічок за елкай)

- Гэта – дзядок Лесавічок. Ён ахоўае лес, усім лясным жыхарам дапамагае. Лесавік вітаецца з вамі. “Добры раніцы”

- Прывітайцесь з Лесавічком “Добры раніцы”

В. – Лесавічок, мы прышлі да цябе ў госці, хочам лес паглядзець ды пагуляць з табой.

- Дзядок Лесавічок падрыхтаваў для вас загадкі. А адгадкі ён схаваў у цудоўную торбачку. Калі выіх адгадаеце, вы даведаецеся, хто жыве ў зімовым лесе. Сядайце на пянькі.

Загадкі ( паказ слайдаў пасля кожнай адгадкі)

(Ліса, воўк, заяц, вавёрка, лось, вожык, мядзведзь)

В. – Як называюць адным словам усіх, хто жыве у лесе? (Дзікія жывёлы)

Малайцы, Лесавічку вельмі прыемна, што вы адгадалі ўсіх дзікіх жывёл. Ён яшчэ хоча з вамі пагуляць.

Гульня “Адзін – шмат”

У лесе жыве не адзін воўк, а шмат …(ваўкоў)

У лесе жыве не адна ліса, а шмат … (ліс)

У лесе жыве не адзін вожыу, а шмат … (вожыкаў)

У лесе жыве не адзін мядзведзь, а шмат … (мядзведзяў)

У лесе жыве не адзін заяц, а шмат…(зайцоў)

У лесе жыве не адна вавёрка, а шмат … (вавёрак)

У лесе жыве не адзін лось, а шмат… (ласёў)

В. – У дарослых дзікіх жывёл ёсць дзіцяняты. Давйце раскажам хто ў каго?

Ня-ня-ня – у лісы … (лісяня)

Ня-ня-ня – у зайчыхі… (зайчаня)

Ня-ня-ня – у мядзведзіцы… (мядзведзяня)

Ня-ня-ня – у ваўчыцы… (ваўчаня)

Ня-ня-ня – у вавёркі… (вавёрчаня)

Ня-ня-ня – у ласіхі… (ласяня)

Ня-ня-ня – у вожычыхі… (важаня, важычаня)

В. – Малайцы і з гэтай гульнёй вы справіліся. Дзеці, Лесавічок прапануе вам трошкі адпачыць і ператварыцца ў жывёл. Вакол сябе павярніцеся і ў жывёлу ператварыцеся. (Фізкультхвілінка0

Мядзведзяня – топ-топ,

А лісяня – хлоп-хлоп,

А ваўчаня – шчоўк-шчоўк,

А зайчаня – скок-скок,

І вавёрчаня – скок-скок,

А ласяня – дрыг-дрыг,

А важаня – шмыг-шмыг.

- Вось як весела гуляюць дзіцяняткі-звяраняткі.
- А у нас таксама ёсць гульня для Лесавічка.

“Ты – мая часцінка”

В. – Я – ліса, аты –мая часцінка. Хто ты? ( Я – кіпцюры)

В. – Ва усіх звяроў у леск ёсць свая хатка. Паглядзіце звяры сумныя, яны хочуць папасці ў хатку. Але не ведаюць, куды ім. лесавічок просіць вас дапамагчы знайсці дзікім жывёлам сваю хатку.

“Хто дзе жыве?”

В. – Дзе спіць мядзведзь? (Мядзведз спіць у бярлозе)

- Дзе жыве ліса? (Ліса жыве ў нары)
- Дзе жыве вавёрка? (Вавёрка жыве ў дупле)
- Дзе хваецца заяц? (Заяц хаваецца пад кустом)
- Дзе жыве воўк? (Воўк жыве у логаве)

В. – Малайцы, з вашай дапамогай усе дзікія жывёлы знайшлі свае хаткі. Лесавічок прапануе вам яшчэ пагуляць у адну гульню. Усе звяры спалохаліся і схаваліся ад нас, толькі хвосцікі адны тырчаць, відаць.

“Чый хвост” (слайды)

В. – Чые хвасты вы бачыце?

Д. – Я бачу вавёрчын хвост

- Я бачу ваўчыны хвост
- Я бачу лісіны хвост
- Я бачу мядзведжы хвосі
- Я бачу зайчыны хвост

В. – Малайцы, Лесавічок вельмі задаволен, што вы так добра ведаеце жывёл.

- Падыйдзіце, калі ласка сюды. Паглядзіце дзе сядзіць ліса? (Ліса сядзіць за елкай)
- Дзе сядзіць воўк? (Воўк сядзіць за елкай)
- Дзе сядзіць вавёрка? (Вавёрка сядзіць на дрэве)

- Дзе сядзіць заяц? (Заяц сядзіць пад кустом)

В. – Малайцы, усіз дзікіх жывёл мы з вамі знайшлі і назвалі, дзе яны сядзяць. Дзеці, а паглядзіце, што гэта ў нас за елачкай? Гэта пачастункі ад вавёрачкі – смачныя арэшкі. Што мы скажам вавёрцы?

Д. – Дзякуй!

В. – Дзеці, нам трэба развітацца з Лесавічком і вяртацца у дзіцячы сад. Ён вельмі задаволены, што вы шмат ведаеце пра лес і паросіць каб вы беражліва адносіліся да леса і да жывёл.

Разам пляснулі ў далоні

Дружна тупаем нагамі

Усё, у што мы туту гулялі,

Мы запомнілі з табой.

“Да пабачэння” ўсім сказалі.

Д. – “Да пабачэння”

В. – І адправіліся дадому.

В. – Дзеці, вам спадабалася наша падарожжа? Дзе мы з вамі сёння былі? А каго вы там бачылі? А якія гульні вам спадабаліся? Адправімся з вамі яшчэ калі-небудзь у падарожжа ў лес?

Літаратура

Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі/ М-ва адукацыі Рэсп.Беларусь.- Мінск:НІА, 2023.- 367 с.